Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

***Кобрыншчына ў падзеях і асобах***

# ЗВОДНЫ КАЛЯНДАР ДАТ, ПАДЗЕЙ КОБРЫНШЧЫНЫ

***краязнаўча-бібліяграфічны***
***к а л я н д а р***

## *2021-2025*



Кобрын
2020

УДК 015(059)(476.7)”2021/2025”
ББК 91(4Беи)я2
343

***Складальнікі:***
*С. Д. Курачук* - галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі

*Л. С. Дардзюк* - бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі

343 **Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны** : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – 200 с.

Зводны краязнаўча-бібліяграфічны каляндар змяшчае звесткі аб знамянальных падзеях Кобрыншчыны на 2021-2025 гг. Даты, уключаныя ў каляндар, адлюстроўваюць падзеі і факты гісторыі, грамадскага, палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця рэгіёна; памятныя даты вядомых людзей, біяграфіі якіх звязаны з краем.

Выданне адрасуецца ўсім, хто займаецца вывучэннем роднага краю, цікавіцца сваёй малой радзімай ці выкарыстоўвае краязнаўчыя звесткі ў прафесійнай дзейнасці.

**УДК 015(059)(476.7)”2021/2025”**
**ББК 91(4Беи)я2**

© Афармленне. Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, 2020

# Прадмова

Зводны краязнаўча-бібліяграфічны каляндар змяшчае звесткі аб знамянальных падзеях Кобрыншчыны на 2021-2025 гг.

Даты, уключаныя ў каляндар, адлюстроўваюць падзеі і факты гісторыі, грамадскага, палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця рэгіёна; памятныя даты вядомых людзей, біяграфіі якіх звязаны з краем. Фактаграфічная інфармацыя дапоўнена кароткімі біяграфічнымі і гістарычнымі даведкамі, бібліяграфічнымі звесткамі аб друкаваных публікацыях, архіўнымі матэрыяламі, гіперспасылкамі на інтэрнэт-рэсурсы.

Выданне адрасуецца ўсім, хто займаецца вывучэннем роднага краю, цікавіцца сваёй малой радзімай ці выкарыстоўвае краязнаўчыя звесткі ў прафесійнай дзейнасці.

Краязнаўчы каляндар можа выкарыстоўвацца пры планаванні работы бібліятэк, правядзенні масавых свят і юбілейных мерапрыемстваў, пры складанні паўнатэкставых краязнаўчых баз даных.


2022

# Асноўныя юбілейныя даты горада і раёна

## *Кобрынскі раён у фактах і падзеях*

***735 гадоў*** з часу першага ўпамінання Кобрына ў Іпацьеўскім летапісе ***(1287)***

***635 гадоў*** з пачатаку існавання дынастыі князей Кобрынскіх ***(1387)***

***265 гадоў*** з часу ўтварэння «Кобрынскага ключа» ***(1757)***

***210 гадоў*** з часу перамогі рускіх войск у вайне 1812 г. (Кобрынскі бой) ***(1812)***

***1882 г.*** У Кобрыне з'явілася чыгуначная станцыя.

***Верасень 1987 г.*** Кобрын адсвяткаваў свой 700-гадовы юбілей.

***20 гадоў*** з часу выдання гісторыка-дакументальнай хронікі Кобрынскага раёна «Памяць» ***(2002)***

# Юбілейныя даты населеных пунктаў Кобрынскага раёна

### *Аграгарадку «Буховіцкі» (2007)– 15 гадоў*

**Белов, Д.** Эффективнее производство - богаче жизнь / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2010. - 3 чэрвеня. - С. 3.

**Жук, Е**. Буховичские зарисовки / Елена Жук // Вечерний Брест. - 2009. - 23 января. - С. 8.

### *Аграгарадку «Кіселявецкі» (2007) – 15 гадоў*

**Сацук, А.** Новая строка в биографии / Алексей Сацук // Кобрынскі веснік. - 2007. - 1жніўня. - С. 1-2.

### *Аграгарадку «Пескаўскі» (2007) – 15 гадоў*

**Сацук, А.** Работы идут полным ходом / Алексей Сацук // Кобрынскі веснік. - 2007. - 26 мая. - С. 1-2.

Ведутся работы по благоустройству Песковского агрогородка.

### *Авады – 275 гадоў з часу першага ўпамінання (1747)*

**Авады** (мясцовая назва Оводы), вёска ў Хідрынскім сельсавеце.

**Авады** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 115.

**Авады** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 561. – (З гісторыі населеных пунктаў).

### *Агароднікі – 425 гадоў з часу першага ўпамінання (1597)*

**Агароднікі** (мясцовая назва Огородныкы), вёска ў Батчынскім сельсавеце.

**Агароднікі** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 115.

**Агароднікі** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 561. – (З гісторыі населеных пунктаў).

### *Альхоўка – 125 гадоў з часу першага ўпамінання (1897)*

**Альхоўка** (мясцовая назва Ольхівка), вёска ў Навасёлкаўскім сельсавеце.

**Альхоўка** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 117.

**Альхоўка** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 562-563. – (З гісторыі населеных пунктаў).

### *Астраўляны – 125 гадоў з часу першага ўпамінання (1897)*

**Астраўляны** (мясцовая назва Островляны), вёска ў Хідрынскім сельсавеце.

**Астраўляны** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 119.

**Астраўляны** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 564. – (З гісторыі населеных пунктаў).

### *Гарадзец – 880 гадоў з часу першага ўпамінання (1142)*

**Гарадзец** (мясцовая назва Городэць), вёска, цэнтр Гарадзецкага сельсавета. З 2008 г. – аграгарадок.

**Гарадзец** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1971. – Т. 3. – С. 346.

**Гарадзец** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1997. – Т. 5. – С. 39.

**Гарадзец** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 133-135.

**Гарадзец** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2012. – Т. 2. – С. 507.

**Гарадзец** // Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Мінск, 2004. – Т. 3. – С. 125.

**Гарадзец** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 572-574. – (З гісторыі населеных пунктаў).

### *Гірск – 125 гадоў з часу першага ўпамінання (1897)*

**Гірск**, вёска ў Кісялевіцкім сельсавеце.

**Гірск** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 136.

**Гірск** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 574-575. – (З гісторыі населеных пунктаў).

### *Гуцкі – 285 гадоў з часу першага ўпамінання (1737)*

**Гуцкі,** вёска ў Батчынскім сельсавеце.

**Гуцкі** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 138.

**Гуцкі** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 576. – (З гісторыі населеных пунктаў).

### *Забава - 125 гадоў з часу першага ўпамінання (1897)*

**Забава,** вёска ў Навасёлкаўскім сельсавеце.

**Забава** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 143-144.

**Забава** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 579-580. – (З гісторыі населеных пунктаў).

### *Завужоўе – 425 гадоў з часу першага ўпамінання (1597)*

**Завужоўе** (мясцовая назва Заужіўе), вёска ў Тэвельскім сельсавеце.

**Завужоўе** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 145.

**Завужоўе** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 580. – (З гісторыі населеных пунктаў).

### *Закалнечча – 125 гадоў з часу першага ўпамінання (1897)*

**Закалнечча** (мясцовая назва Закалынэччэ), вёска ў Кісялевіцкім сельсавеце.

**Закалнечча** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 145.

**Закалнечча** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 580-581. – (З гісторыі населеных пунктаў).

### *Калюхі – 235 гадоў з часу першага ўпамінання (1787)*

**Калюхі** (мясцовая назва Колюхы), вёска ў Кісялевіцкім сельсавеце.

**Калюхі** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 152.

**Калюхі** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 585. – (З гісторыі населеных пунктаў).

### *Лука – 125 гадоў з часу першага ўпамінання (1897)*

**Лука,** вёска ў Астроміцкім сельсавеце. З 2009 г. – аграгарадок.

**Лука** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1972. – Т. 6. – С. 433.

**Лука** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 161.

**Лука** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 591. – (З гісторыі населеных пунктаў).

### *Мазуры – 125 гадоў з часу першага ўпамінання (1897)*

**Мазуры,** вёска ў Хідрынскім сельсавеце.

**Мазуры** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 166.

**Мазуры** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 593-594. – (З гісторыі населеных пунктаў).

### *Малышы – 305 гадоў з часу першага ўпамінання (1717)*

**Малышы,** вёска ў Тэвельскім сельсавеце.

**Малышы** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 166-167.

### ***Мухаўлокі – 295 гадоў з часу першага ўпамінання (1727)***

**Мухаўлокі** (мясцовая назва Муховлокы), вёска ў Астроміцкім сельсавеце.

**Мухаўлокі** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 168-169.

**Мухаўлокі** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 595. – (З гісторыі населеных пунктаў).

**Максімчык, А.** Весяліліся – спявалі, вяскоўцаў шанавалі / Аляксей Максімчык // Кобрынскі веснік. – 2007. – 11 жніўня. – С. 2. - Вёска Мухаўлокі адзначыла 280-годдзе.

### ***Навасёлкі – 520 гадоў з часу першага ўпамінання (1502)***

**Навасёлкі** (мясцовая назва Новосілкы), вёска, цэнтр Навасёлкаўскага сельсавета. З 2009 г. – аграгарадок.

**Навасёлкі** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 170-172.

**Навасёлкі** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 596-597. – (З гісторыі населеных пунктаў).

### ***Навасёлкі – 125 гадоў з часу першага ўпамінання (1897)***

**Навасёлкі** (мясцовая назва Новосілкы), вёска ў Астроміцкім сельсавеце.

**Навасёлкі** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 170.

**Навасёлкі** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 596. – (З гісторыі населеных пунктаў).

### ***Нятрэба – 125 гадоў з часу першага ўпамінання (1897)***

**Нятрэба** (мясцовая назва Нэтрэба), вёска ў Гарадзецкім сельсавеце.

**Нятрэба** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 172.

**Нятрэба** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 597. – (З гісторыі населеных пунктаў).

### ***Пералессе - 125 гадоў з часу першага ўпамінання (1897)***

**Пералессе** (мясцовая назва Пэрэліссе), вёска ў Осаўскім, цяпер Дзівінскім сельсавеце.

**Пералессе** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 177.

**Пералессе** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 600-601. – (З гісторыі населеных пунктаў).

### ***Плашчыны – 125 гадоў з часу першага ўпамінання (1897)***

**Плашчыны** (мясцовая назва Плошчыны), вёска ў Буховіцкім сельсавеце.

**Плашчыны** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 179.

**Плашчыны** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 602. – (З гісторыі населеных пунктаў).

## *Птушкафабрыка, пасёлак - 60 гадоў з часу першага ўпамінання (1962)*

**Птушкафабрыка**, пасёлак у Батчынскім сельсавеце. Заснаваны ў 1962 г. разам з птушкафабрыкай.

**Птушкафабрыка, пасёлак** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 181.

**Птушкафабрыка,** пасёлак // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 603. – (З гісторыі населеных пунктаў).

## *Рыбна – 125 гадоў з часу першага ўпамінання (1897)*

**Рыбна,** вёска ў Кісялевецкім сельсавеце.

**Рыбна** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 182.

**Рыбна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 604. – (З гісторыі населеных пунктаў).

## *Стасюкі – 280 гадоў з часу першага ўпамінання (1742)*

**Стасюкі** (мясцовая назва Стасюкы), вёска ў Тэвельскім сельсавеце.

**Стасюкі** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 185.

**Стасюкі** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 607. – (З гісторыі населеных пунктаў).

## *Турная – 385 гадоў з часу першага ўпамінання (1637)*

**Турная**, вёска ў Залескім сельсавеце.

**Турная** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 188-189.

**Турная** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 609. – (З гісторыі населеных пунктаў).

## *Хадынічы - 455 гадоў з часу першага ўпамінання (1567)*

**Хадынічы** (мясцовая назва Ходынычы), вёска ў Навасёлкаўскім сельсавеце.

**Хадынічы** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 191-192.

**Хадынічы** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 611. – (З гісторыі населеных пунктаў).

## *Чаравачыцы - 605 гадоў з часу першага ўпамінання (1417)*

**Чаравачыцы** (мясцовая назва Чырыватычы), вёска ў Батчынскім сельсавеце.

**Чаравачыцы** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобл. - С. 194-195.

**Чаравачыцы** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 613. – (З гісторыі населеных пунктаў).

**Астапчук, Ю.** Чаравачыцы / Ю. Астапчук // Народная трыбуна. – 2004. – 10 студеня. – С. 4.

### *Шуры – 125 гадоў з часу першага ўпамінання (1897)*

**Шуры**, вёска ў Гарадзецкім сельсавеце.

**Шуры** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 196.

**Шуры** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка.– Мінск, 2002. – С. 613-614. – (З гісторыі населеных пунктаў).

### *Яўсімавічы – 315 гадоў з часу першага ўпамінання (1707)*

**Яўсімавічы** (мясцовая назва Еўсымовычы), вёска ў Буховіцкім сельсавеце.

**Яўсімавічы** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 198.

**Яўсімавічы** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 615. – (З гісторыі населеных пунктаў).

# Памятныя даты вядомых людзей, жыццё і дзейнасць якіх звязана з краем

### *100 гадоў з дня нараджэння І. В. Азарчука (1922)*

**Азарчук Іван Васільевіч** нарадзіўся ў 1922 г. у в. Мяфёдавічы. Быў адным з арганізатараў камсамольскага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны, сувязны партызанскіх атрадаў Брэсцкага партызанскага злучэння.

**Азарчук Іван Васільевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 219. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *105 гадоў з дня нараджэння Ф. М. Алісіевіча (1917)*

**Алісіевіч Фёдар Максімавіч** (1917–1975) - Ганаровы грамадзянін горада Кобрына. Нарадзіўся ў 1917 г. у в. Каўпыніца (цяпер в. Колас) Крупскага раёна Мінскай вобласці. У кастрычніку 1943 г. прызначаны памочнікам камісара партызанскай брыгады імя Чапаева па камсамоле, адначасова з'яўляўся сакратаром Кобрынскага раённага падпольнага камітэта ЛКСМБ. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. З сакавіка 1945 г. да снежня 1950 г. працаваў у апараце Брэсцкага абкама ЛКСМБ, пазней Брэсцкага абкама КПБ. Звання «Ганаровы грамадзянін горада Кобрына» Алісіевіч Фёдар Максімавіч удастоены ў 1964 г.

**Алісіевіч Фёдар Максімавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 213. – (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

**Долготович, Б. Д.** Алисиевич Федор Максимович / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 30.

**Алісіевіч Фёдар Максімавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп'ютарны дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 9.

### *80 гадоў з дня нараджэння Г. А. Антанюка (1942)*

**Антанюк Георгій Аляксандравіч** – беларускі філосаф, доктар філасофскіх навук (1991), прафесар (1993). Нарадзіўся 13 лістапада 1942 г. у в. Мацы.

**Антонюк Георгий Александрович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Мінск, 2009. – Кн. 1. - С. 22.

**Антанюк Георгій Аляксандравіч** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2010. – Т. 1. - С. 171.

**Антанюк Георгій Аляксандравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 431. – (Імі ганарацца землякі).

**Елсуков, А. Н.** Антонюк Георгий Александрович / А. Н. Елсуков // Социологическая энциклопедия. – Минск, 2005. – С. 20.

**Антанюк Георгій Аляксандравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 12-13.

### *100 гадоў з дня нараджэння С. Н. Батуліна (1922)*

**Батулін Сцяпан Нічыпаравіч** нарадзіўся ў 1922 г. у в. Задзернава. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1943 г. знаходзіўся ў партызанскім атрадзе імя Фрунзе Брэсцкага злучэння, з 1944 г. на фронце ў радах Савецкай арміі. Пасля вайны працаваў на лесараспрацоўках Урала. З 1956 г. па 1974 г. быў брыгадзірам паляводчай брыгады ў калгасе «Зара» Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1965), іншымі ўзнагародамі.

**Батулін Сцяпан Нічыпаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 426-427. – (Вызначыліся працай).

**Батулін Сцяпан Нічыпаравіч** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 14.

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. **Степан Никифорович Батулин** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

### *75 гадоў з дня нараджэння А. Я. Бельскага (1947)*

**Бельскі Аляксей Якімавіч** - вучоны. Нарадзіўся ў 1947 г. у в. Стрыі. Кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі.

**Бельскі Аляксей Якімавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 432. – (Імі ганарацца землякі).

**Бельскі Аляксей Якімавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» , цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 12-13.

## *85 гадоў з дня нараджэння А. В. Букача (1937)*

**Букач Антон Васільевіч** (1937-2016). Нарадзіўся 7 красавіка 1937 г. у в. Гайкоўка Кобрынскага павета (цяпер Гайкоўка Кобрынскага раёна). Працаваў інструктарам Кобрынскага гаркама КПБ, намеснікам дырэктара, дырэктарам СПТВ-102 будаўнікоў. З 1982 г. ён - дырэктар прафтэхвучылішча №105 народных мастацкіх промыслаў, дзе і прапрацаваў да 2003 г. З ліпеня 2003 па ліпень 2007 г. - намеснік дырэктара па вытворчым навучанні УА «Кобрынскі дзяржаўны мастацкі прафесійна-тэхнічны каледж». У 2000 г. А. В. Букачу прысвоена званне «Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь». Узнагароджаны медалямі «Ветэран працы» (1987), Францыска Скарыны (2000); юбілейным медалём «За доблесную працу. А. В. Букач занесены ў ганаровую кнігу «Хто ёсць хто. Дзелавы свет СНД».

**Букач Антон Васильевич** // Кто есть Кто в Республике Беларусь : справочное издание. – Минск, 2005. – Т. 2. – С. 48.

**Букач Антон Васильевіч** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 105-106.

**Антон Васильевич Букач** : [некролог] // Кобрынскі веснік. - 2016. — 16 сакавіка. — С. 3. - Ушел из жизни А. В. Букач - уроженец д. Гайковка, удостоенный звания «Заслуженный учитель».

## *95 гадоў з дня нараджэння П. М. Валасюка (1927)*

**Валасюк Пётр Мікалаевіч** нарадзіўся ў 1927 г. у в. Дзеткавічы Драгічынскага раёна. У 1958 г. інструктар у школе ДТСААФ у Кобрыне. З 1959 г. працаваў выкладчыкам фізкультуры і біялогіі ў СШ № 2 г. Кобрына. У 1971-1989 гг. - дырэктар Кобрынскага Дома юных натуралістаў. Званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» прысвоена ў 1982 г.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. **Валасюк Пётр Мікалаевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 430. - (Вызначыліся працай).

**Валасюк Пётр Мікалаевіч** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 106.

**Пашковіч, Л.** Чалавек з вялікай справы / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2017. — 22 ліпеня. — С. 3. - Былы дырэктар тагачаснай станцыі юнатаў, заслужаны настаўнік БССР П. М. Валасюк адзначыў 90-гадовы юбілей.

## *80 гадоў з дня нараджэння Л. Я. Верхавец (1942)*

**Верхавец Людміла Якаўлеўна** - вучоны. Нарадзілася ў 1942 г. у в. Літвінкі. Кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Віцебскага тэхнічнага ўніверсітэта.

**Верхавец Людміла Якаўлеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 432. - (Імі ганарацца землякі).

**Верхавец Людміла Якаўлеўна** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 18-19.

## *115 гадоў з дня нараджэння В. Е. Ворана (1907)*

**Воран Васіль Еўдакімавіч** нарадзіўся ў 1907 г. у в. Літвінкі. Член КПЗБ. У 1940 г. быў выбраны першым старшынёй калгаса «Заветы Ільіча». Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Знамені, медалямі. З'яўляўся персанальным пенсіянерам мясцовага значэння.

**Воран Васіль Еўдакімавіч** [Электронны рэсурс] // // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - – Мінск, 2002. - (Вызначыліся працай).

## *100 гадоў з дня нараджэння А. А. Вяткіна (1922)*

**Вяткін Анатоль Аляксандравіч** нарадзіўся ў 1922 г. У Вялікую Айчынную вайну са жніўня 1942 г. на фронце, артылерыст. Удзельнічаў у вызваленні Кобрына. З мая 1945 г. у запасе, палкоўнік. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, 16 медалямі.

**Вяткін Анатоль Аляксандравіч** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 234. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

## *110 гадоў з дня нараджэння К. С. Гапасюка (1912)*

**Гапасюк Канстанцін Сцяпанавіч** (1912-1991). Нарадзіўся 7 верасня 1912 г. у в. Рэчыца. У верасні 1941 г. стаў партызанам атрада імя Чапаева, камандаваў спачатку ўзводам, потым ротай. У студзені 1944 г. на базе атрада імя Чапаева была створана партызанская брыгада імя Чапаева Брэсцкай вобласці, камандзірам якой у студзені - маі, а з мая 1944 г. намеснікам камандзіра быў К. С. Гапасюк. Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Пасля вызвалення Кобрыншчыны ад фашысцкіх захопнікаў працаваў намеснікам старшыні Кобрынскага гарсавета, потым на гаспадарчай рабоце.

**Гапасюк Канстанцін Сцяпанавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - (Вызначыліся працай). – Мінск, 2002. - С. 215. – (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

## *220 гадоў з дня нараджэння С. Б. Горскага (1802)*

**Горскі Станіслаў Батыс** - беларускі прыродазнавец, медык, педагог, папулярызатар навукі, прафесар. Нарадзіўся 6 мая 1802 г. у в. Дворац Кобрынскага павета.

**Горскі Станіслаў Батыс** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1997. – Т. 5. – С. 366.

**Горскі Станіслаў Батыс** // Энцыклапедыя прыроды Беларусі : в 5 т. – Мінск, 1983. – Т. 2. – С. 111.

**Горский Станислав Батис** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2006. – Т. 3. – С. 159.

**Горский Станислав Батис** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. – Кн. 1. – С. 296.

**Горскі Станіслаў Батыс** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 30-31.

### *90 гадоў з дня нараджэння М. У. Даменікана (1932)*

**Даменікан Мікалай Уладзіміравіч** нарадзіўся 1 сакавіка 1932 г. у в. Грускова Нясвіжскага павета Навагрудскага ваяводства (цяпер Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці). У 1971-1973 гг. старшыня Кобрынскага райвыканкама. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена за поспехі ў вытворчасці прадуктаў жывёлагадоўлі ў зімовы перыяд 1984-1985 гг. і датэрміновае выкананне заданняў XI пяцігодкі. Дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у 1975-1996 гг. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (двойчы), Працоўнага Чырвонага Сцяга (двойчы), «Знак Пашаны», залатым, 3 сярэбранымі і 3 бронзавымі медалямі ВДНГ СССР і іншымі ўзнагародамі.

**Даменікан Мікалай Уладзіміравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 451-452. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

**[Доменикан Николай Владимирович**] : [некролог] // Заря. – 2012 - 18 февраля. – С. 4. - Доменикан Н. В. с 1971 по 1973 год возглавлял Кобринский районный исполнительный комитет.

### *100 гадоў з дня нараджэння З. З. Дзенісюка (1922)*

**Дзенісюк Захар Захаравіч** нарадзіўся ў 1922 г. у в. Мяфёдавічы. З пачатку Вялікай Айчыннай вайны падпольшчык, наладзіў сувязь з Турнянскім антыфашысцкім камітэта. З 1943 г. у асобным партызанскім атрадзе імя Катоўскага, разведчык, падрыўнік. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Пасля вайны працаваў старшынёй сельсавета, у гарадской камунальнай гаспадарцы Кобрына.

**Дзенісюк Захар Захаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 220. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *100 гадоў з дня нараджэння Г. Я. Дмітрук (1922)*

**Дзмітрук Ганна Якаўлеўна** нарадзілася ў 1922 г. у в. Барысава. У 1948 г. адной з першых уступіла ў калгас. Працавала даяркай больш за 30 гадоў. Узнагароджана ордэнам Леніна (1971), медалём.

**Дзмітрук Ганна Якаўлеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 427. – (Вызначыліся працай).

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. **Анна Яковлевна Дмитрук** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

### *85 гадоў з дня нараджэння З. У. Дубінкі (1937)*

**Дубінка Зоя Уладзіміраўна** нарадзілася 6 чэрвеня 1937 г. у в. Дзядзічы Іўеўскага раёна. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі (1986). Скончыла Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1967). Працавала заатэхнікам, намеснікам старшыні калгаса «Зара» Кобрынскага раёна. Узнагароджана ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак Пашаны».

**Дубінка Зоя Уладзіміраўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 429. - (Вызначыліся працай).

**Дубінка Зоя Уладзіміраўна** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 129-130.

**Заслуженные** работники Беларуси. **Дубинка Зоя Владимировна** // Хидры - первый агрогородок на Кобринщине : информационно - аналитический очерк / Кобринская центральная районная библиотека, отдел обслуживания и информации ; сост. Светлана Курачук, гл. библиограф. – Кобрин, 2007. – С. 40. – (Наша гордость, наша слава).

## *85 гадоў з дня нараджэння М. К. Дубінкі (1937)*

**Дубінка Міхаіл Калістратавіч** (1937-2011). Нарадзіўся 23 чэрвеня 1937 г. у в. Хідры. З 1960 г. стаў працаваць брыгадзірам у калгасе «Зара» Кобрынскага раёна. У 1976 г. за поспехі ў працы яму прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Узнагароджаны ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР.

**Дубинка Михаил Калистратович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 355.

**Дубинка Михаил Калистратович** // Твои герои, Беларусь! Герои Социалистического Труда : биографический справочник. – Минск, 2014. – С. 96.

**Дубінка Мікалай Калістратавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 426. - (Вызначыліся працай).

**Дубінка Мікалай Калістратавіч** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 9-11.

**Их доблестный** труд отмечен звездой Героя. **Михаил Калистратович Дубинка** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

## *100 гадоў з дня нараджэння К. Е. Дулько (1922)*

**Дулько Канстанцін Еўдакімавіч** нарадзіўся ў 1922 г. у Камянецкім раёне Брэсцкай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну з 1942 г. у партызанскім атрадзе імя Чапаева, сувязны, падрыўнік. Удзельнічаў у вызваленні Кобрына, Прыбалтыкі. Узнагароджаны медалямі. Пасля вайны працаваў старшынёй калгаса «Шлях да камунізму», старшынёй Залескага сельсавета, сакратаром партарганізацыі калгаса імя Дзімітрова.

**Дулько Канстанцін Еўдакімавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 220. – (Змагаліся ў тыле ворага).

## *220 гадоў з дня нараджэння І. Жалязоўскага (1802)*

**Ігнацій Жалязоўскі** (свец. Якаў Лявонцьевіч) (1802-1872) - рэлігійны праваслаўны дзеяч, епіскап Брэсцкі. Нарадзіўся 10 (22) студзеня 1802 г. у в. Вялікія Сяхновічы Кобрынскага павета (цяпер Жабінскаўскі раён Брэсцкай вобласці) у сям'і ўніяцкага святара. Пасля паспяховага завяршэння навучання ён вярнуўся на радзіму ў якасці настаўніка Кобрынскага духоўнага вучылішча, дзе працаваў да 1834 г. У 1836-1839 гг. - інспектар Літоўскай семінарыі. У 1839-1948 гг. - настаяцель Барысаглебскай (Каложскай) царквы ў Гродне. У 1848-1970 гг. - вікарны епіскап Брэсцкі, жыў у Жыровічах і Гродне (з 1852). З 1875 г. у Віленскім духоўным вучылішчы была ўстаноўлена імянная стыпендыя епіскапа Ігнацыя для дзяцей-сірот, якія паказвалі выдатныя здольнасці ў авалоданні навукамі і добрых у сваіх паводзінах.

**Бензярук, А.** Жалязоўскі Ігнацій / Анатоль Бензярук // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 1996. - Т. 3. – С. 364.

**Бензярук, А. Р**. Жалязоўскі І. (1802-1872) / А. Р. Бензярук // Асветнікі зямлі Беларускай : энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 2001. - С. 164.

**Жалязоўскі Ігнацій** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Жабінкаўскага раёна. - Мінск, 1999. - С. 131-133, 492, 502.

## *85 гадоў з з дня нараджэння С. Д. Зінчука (1937)*

**Зінчук Сцяпан Дзмітрыевіч** – вучоны-педагог. Нарадзіўся ў 1937 г. у в. Астромічы. Кандыдат педагагічных навук, дацэнт Беларускага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка. Сцяпан Дзмітрыевіч - выдатнік адукацыі БССР і выдатнік адукацыі СССР.

**Зінчук Сцяпан Дзмітрыевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 435. – (Імі ганарацца землякі).

**Зінчук Сцяпан Дзмітрыевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 48-49.

### *75 годоў з дня нараджэння М. В. Знахарчука (1947)*

**Знахарчук Мікалай Васільевіч** нарадзіўся 22 кастрычніка 1947 г. у в. Дзівін. Закончыў Севастопальскае вышэйшае ваенна-марское вучылішча. Па размеркаванні трапіў на Паўночны флот у 1-ю флатылію атамных падводных лодак. Геройскі загінуў у 1976 г. Цаной асабістага жыцця тры капітаны, у тым ліку і М. Знахарчук, ліквідавалі пажар на лодцы і яго наступствы.

**Знахарчук Мікалай Васільевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 435. - (Імі ганарацца землякі).

**Вядомыя** людзі, ураджэнцы в. Дзівін. **Знахарчук** Мікалай Васільевіч // Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні : гісторыка-краязнаўчы нарыс да 550-годдзя з часу першага ўпамінання в. Дзівін Кобрынскага раёна / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 39-40.

### *60 гадоў з дня нараджэння В. І. Іўчанкава (1962)*

**Іўчанкаў Віктар Іванавіч** - лінгвіст, педагог, журналіст. Нарадзіўся 28 чэрвеня 1962 у в. Хадынічы. Заснавальнік беларускай навуковай школы дыскурснага аналізу сродкаў масавай інфармацыі, вядучы распрацоўшчык сучасных напрамкаў ва ўпарадкаванні норм правапісу беларускай мовы, аўтар вучэбных дапаможнікаў для сярэдняй і вышэйшай школы, метадычных праграм, выдатнік адукацыі Беларусі, лаўрэат прэміі Беларускага саюза журналістаў «Залатое пяро» (2010). Кандыдат філалагічных навук (1988), дацэнт.

**Ивченков Виктор Иванович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область: в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 425.

**Іўчанкаў Віктар Іванавіч** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.].– Мінск, 2012. – Т. 4. - С. 229.

**Іўчанкаў Віктар Іванавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 435 : фота. - (Імі ганарацца землякі).

**Іўчанкаў Віктар Іванавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 54-57.

### *90 гадоў з дня нараджэння В. К. Казловіча (1932)*

**Казловіч Віталій Кірылавіч** нарадзіўся ў 1932 г. у в. Іласк. Больш за 20 гадоў узначальваў паляводчую брыгаду ў калгасе «Праўда». Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1972), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1971), іншымі ўзнагародамі.

**Казловіч Віталь Кірылавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 427. – (Вызначыліся працай).

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. Виталий Кириллович **Козлович** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

### *100 гадоў з дня нараджэння Г. С. Камялеўскай (1922)*

**Камялеўская Ганна Сяргееўна** нарадзілася ў 1922 г. у в. Андронава. Працавала даяркай у калгасе, з 1962 г. - на Кобрынскай птушкафабрыцы. Узнагароджана ордэнамі Леніна (1971), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1975), іншымі ўзнагародамі.

**Камялеўская Ганна Сяргееўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 427. - (Вызначыліся працай).

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. **Анна Сергеевна Камелевская** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

### *120 гадоў з дня нараджэння Ф. Е. Кастылюка (1902)*

**Кастылюк Феадосій Емяльянавіч**. Нарадзіўся ў 1902 г. у в. Паляцічы. У 1924 г. уступіў у КПЗБ. Быў сакратаром ячэйкі ў роднай вёсцы, членам Кобрынскага райкама. У Вялікую Айчынную вайну сувязны партызанскага атрада імя Чапаева.

**Кастылюк Феадосій Емяльянавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 114. – (Удзельнікі рэвалюцыйных выступленняў на Кобрыншчыне (1921-1939).

### *100 гадоў з дня нараджэння В. С. Качана (1922)*

**Качан Віктар Сцяпанавіч** (1922-1982). Нарадзіўся 21 лістапада 1922 г. у в. Петрыцкае Брагінскага раёна Гомельскай вобласці, у сялянскай сям'і. З лістапада 1943 г. у Чырвонай арміі. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Славы III ступені, медалём. Пасля дэмабілізацыі ў 1946 г. быў дырэктарам сямігадовай школы ў в. Хідры, з 1961 г. сярэдняй школы ў в. Залессе, потым загадчыкам Кобрынскага райана. З 1963 г. працаваў загадчыкам вучэбнай часткі школы рабочай моладзі, у 1967-1982 гг. - дырэктарам сярэдняй школы № 1 Кобрына.

**Качан Віктар Сцяпанавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 243. – (Крутымі дарогамі вайны).

### *110 гадоў з дня нараджэння М. І. Кірылава (1912)*

**Кірылаў Міхаіл Ільіч** (1912-1992). Нарадзіўся ў в. Ігнацьеўка Новасібірскай вобласці, Расія. У 1936 г. закончыў настаўніцкі інстытут у г. Омск. У час вайны быў у партызанскім атрадзе імя Чапаева. У 1944-1945 гг. - загадчык Кобрынскага раённага аддзела народнай адукацыі, з 1945 г. настаўнік, потым завуч СШ № 1 Кобрына, у 1963-1976 гг. - дырэктар СШ № 5. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Званне «Заслужаны настаўнік» прысвоена ў 1967 г.

**Кірылаў Міхаіл Ільіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 430. – (Вызначыліся працай).

**Кірылаў Міхаіл Ільіч** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 108-109.

**Сіманава, І. Э.** Школьная адукацыя Кобрыншчыны ў даваенныя і першыя пасляваенныя гады / Ірына Сіманава // Карані і кроны : гісторыя Кобрыншчыны: першая палова XX стагоддзя / [укл.: Ю. А. Барысюк, А. А. Мезенцэва]. - Брэст, 2017. – С. 108-134.

### *75 гадоў з дня нараджэння В. У. Краснапрошына (1947)*

**Краснапрошын Віктар Уладзіміравіч** - прафесар, доктар тэхнічных навук. Нарадзіўся 23 лістапада 1947 г. у г. Кобрыне Брэсцкай вобласці. У 1974 г. закончыў факультэт прыкладной матэматыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Віктар Уладзіміравіч з'яўляецца навукоўцам у вобласці матэматычнай кібернетыкі і інфарматыкі. Ён мае больш 260 навуковых прац, у тым ліку 7 кніг. У цяперашні час В. У. Краснапрошын

- загадчык кафедры інфармацыйных сістэм кіравання факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, віцэ-прэзідэнт Беларускай асацыяцыі па распазнанні і аналізу малюнкаў, замежны акадэмік Іспанскай Каралеўскай Акадэміі эканомікі і фінансаў, член кіраўнікоў саветаў міжнародных навуковых асацыяцый (AEDEM, AMSE, SIGEF), член дзяржаўнага экспертнага савета Рэспублікі Беларусь па інфарматызацыі, вылічальнай тэхніке і інфармацыйных тэхналогіях.

**Краснопрошин Виктор Владимирович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 507.

**Краснапрошын Віктар Уладзіміравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 73-74.

### *105 гадоў з дня нараджэння К. К. Краўчука (1917)*

**Краўчук Канстанцін Кірылавіч** нарадзіўся ў 1917 г. у в. Нарты Мамадышскага раёна Татарстана. У 1920-я гады сям’я вярнулася ў Кобрын. З сакавіка 1943 г. да чэрвеня 1944 г. ваяваў у партызанскім атрадзе імя Чапаева брыгады імя Чапаева. Удзельнічаў у многіх партызанскіх акцыях, але больш за ўсё вызначыўся як падрыўнік: на яго рахунку 23 варожыя эшалоны, узарваныя або пушчаныя пад адхон. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Пасля вайны працаваў лесніком у в. Дахлава Кобрынскага раёна, пазней жыў у Кобрыне.

**Краўчук Канстанцін Кірылавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 221. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *70 гадоў з дня нараджэння В. А. Купрыянюк (1952)*

**Купрыянюк Валянціна Аляксееўна** - доктар эканамічных навук. Нарадзілася ў 1952 г. у в. Буховічы Кобрынскага раёна. Вучылася ў Буховіцкай базавай школе. Закончыла СШ № 4 г. Кобрына. Пасля заканчэння школы паступіла ў Мінскі інстытут народнай гаспадаркі, атрымала спецыяльнасць «эканаміст». Пазней Валянціна Аляксееўна закончыла вышэйшую партыйную школу. Працавала першым сакратаром райвыканкама камсамола ў Лунінцы, потым у Брэсце ў аблвыканкаме. Сёння В. А. Купрыянюк жыве і працуе ў Маскве. Нягледзячы на пенсійны ўзрост, працягвае працаваць у Маскоўскай акадэміі навук.

**Купрыянюк Валянціна Аляксееўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 437. – (Імі ганарацца землякі).

**Купрыянюк Валянціна Аляксееўна** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 83.

### *95 гадоў з дня нараджэння М. Т. Куца (1927)*

**Куц Мікалай Трафімавіч** нарадзіўся 20 сакавіка 1927 г. у в. Сухоўчыцы. У 1942-1943 гг. быў членам падпольнай антыфашысцкай групы, сувязным партызанскіх атрадаў імя Чарнака, імя Фрунзе, імя Сталіна. У 1948-1980 гг. працаваў у органах унутраных спраў. Узнагароджаны медалямі.

**Куц Мікалай Трафімавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 222. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *105 гадоў з дня нараджэння П. Ф. Лакаткова (1917)*

**Лакаткоў Пётр Фёдаравіч** нарадзіўся ў 1917 г. у Чабаркульскім раёне Чалябінскай вобласці. З першых дзён вайны ўдзельнічаў у абарончых баях, трапіў у палон, уцёк. Уключыўся ў партызанскую барацьбу на Брэстчыне, удзельнічаў у вызваленні Кобрына. З 1944 г. у дзеючай арміі, ваяваў на 1-м Украінскім фронце, разведчык. Пасля дэмабілізацыі з 1946 г. працаваў у Кобрыне. Узнагароджаны медалямі.

**Лакаткоў Пётр Фёдаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 243-244. – (Крутымі дарогамі вайны).

### *105 гадоў з дня нараджэння С. І. Лебедзева (1917)*

**Лебедзеў Сцяпан Іванавіч** (1917–1983). Нарадзіўся 27 снежня 1917 г. у Верхатурскім раёне Свярдлоўскай вобласці. У 1939 г. закончыў Пермскую авіяцыйную школу і быў накіраваны ў 28-ы знішчальны авіяполк. У ліпені 1941 г. быў цяжка паранены, пасля лячэння накіраваны ў запасны авіяполк. З мая 1942 г. камандзір звяна, намеснік камандзіра авіяэскадрыллі 435-га знішчальнага палка на Карэльскім фронце. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Айчыннай вайны І ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі. Пасля вайны жыў і працаваў у Кобрыне.

**Лебедзеў Сцяпан Іванавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 244. – (Крутымі дарогамі вайны).

### *125 гадоў з дня нараджэння М. П. Леановіча (1897)*

**Леановіч Максім Пракопавіч** (1897–1968). Нарадзіўся ў 1897 г. у в. Выгада Кобрынскага павета. Адзін з кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху ў Брэсцкай вобласці.

**Леановіч Максім Пракопавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 215-216. – (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

### *100 гадоў з дня нараджэння І. С. Любімава (1922)*

**Любімаў Ігар Сяргеевіч** нарадзіўся ў 1922 г. У Вялікую Айчынную вайну ў 1941-1945 гг. на фронце, ад камандзіра ўзвода даслужыўся да памочніка начальніка штаба 60-га гвардзейскага Кобрынскага карпуснога артылерыйскага палка. Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны І ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. Пасля вайны дацэнт Ваеннай артылерыйскай акадэміі імя Калініна ў Санкт-Пецярбургу.

**Любімаў Ігар Сяргеевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 235-236. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

### *115 гадоў з дня нараджэння А. В. Лячова (1907)*

**Лячоў Аляксандр Васільевіч** нарадзіўся ў 1907 г. у в. Соніна Балахнінскага раёна Ніжагародскай вобл. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны служыў у Брэсцкім аблваенкамаце. Удзельнічаў у баях у Брэсце. З сакавіка 1942 г. да красавіка 1944 г. у партызанскім атрадзе імя Катоўскага. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны І ступені, медалямі. У 1944-1970 гг. - на гаспадарчай рабоце ў Брэсце.

**Лячоў Аляксандр Васільевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 223. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *75 гадоў з дня нараджэння М. А. Макарука (1947)*

**Макарук Мікалай Арсенцьевіч** – вучоны. Нарадзіўся 1 студзеня 1947 г. у в. Мацы Кобрынскага раёна. Кандыдат вэтэрынарных навук, дацэнт Віцебскай акадэміі вэтэрынарнай медыцыны.

**Макарук Мікалай Арсенцьевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 437. – (Імі ганарацца землякі).

**Макарук Мікалай Арсенцьевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 91-92.

### *195 гадоў з дня нараджэння У. Ю. Малахоўскага (1827)*

**Малахоўскі Уладзіслаў Юльянавіч** (1827-1900) – рэвалюцыянер, вынаходнік, фотааматар. Нарадзіўся ў 1827 г. у маёнтку Мацы Кобрынскага павета. Ідэямі У. Ю. Малахоўскага скарыстаўся амерыканскі бізнесмен Джордж Істмен, які першым выпусціў на рынак фотаапарат «Кодак» з касетамі са скручанай плёнкай. Невядома, ці з'явілася б фірма «Кодак», фотаапараты якой сёння карыстаюцца папулярнасцю ва ўсім свеце, калі б беларуская зямля не падарыла свету Уладзіслава Малахоўскага.

**Кісялёў, Г.** Малахоўскі Уладзіслаў Юльянавіч / Г. В. Кісялёў, В. Ф. Шалькевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 2000. - Т. 10. - С. 14.

**Кісялёў, Г. В.** Малахоўскі Уладзіслаў Юльянавіч / Г. В. Кісялёў // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. - Мінск, 1972. - Т. 6. - С. 571.

**Кісялёў, Г.** Малахоўскі Уладзіслаў Юльянавіч / Генадзь Кісялёў, Вячаслаў Шалькевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 1999. - Т. 5. - С. 57.

**Малаховский Владислав Юльянович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 66-67.

**Малахоўскі Уладзіслаў Юльянавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 92-95.

### *100 гадоў з дня нараджэння А. І. Марозава (1922)*

**Марозаў Арсен Іванавіч** (1922-1944) – удзельнік вызвалення Беларусі ў Вялікай Айчыннай вайне, Герой Савецкага Саюза (1945), імем якога названы сквер, вуліца ў г. Кобрыне. У складзе 149 Чырванасцяжнага Памеранскага знішчальнага палка, які базіраваўся на Кобрынскім аэрадроме, старшы лейтэнант А. Марозаў быў намеснікам камандзіра эскадрыллі. Загінуў геройскі ў 1944 г. Пахаваны ў брацкай магіле савецкіх воінаў у Кобрыне.

**Марозаў Арсен Іванавіч** // Ваенная энцыклапедыя Беларусі = Военная энциклопедия Беларуси. – Мінск, 2010. – С. 625-626.

**Марозаў Арсен Іванавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 233. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

**Морозов Арсений Иванович** // Их именами названы… : энциклопедический справочник. – Минск, 1987. – С. 432.

**Морозов Арсений Иванович** // Навечно в сердце народном : [книга о Героях Советского Союза]. – Минск, 1977. – С. 320.

### *70 гадоў з дня нараджэння М. А. Мартынавай (1952)*

**Мартынава Марыя Аляксееўна** – кандыдат хімічных навук. Нарадзілася 23 студзеня 1952 г. у г. Кобрыне. Бацька Марыі Аляксееўны – вядомы даследчык гісторыі Кобрыншчыны, першы дырэктар музея імя А. В. Суворава, Ганаровы грамадзянін г. Кобрына А. М. Мартынаў. У 1973 г. Марыя Мартынава закончыла фізічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. З 1978 г. працуе ў Інстытуце біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН Беларусі (да 2004 г. - Інстытут фотабіялогіі НАН Беларусі). З 2005 г. М. А. Мартынава ўзначальвае лабараторыю біяфізікі і інжынерыі клеткі інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

**Мартынава Марыя Аляксееўна** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 95-97.

### *110 гадоў з дня нараджэння І. Ф. Мілаяніна (1912)*

**Мілаянін Іван Фёдаравіч** (1912–1994) - Ганаровы грамадзянін горада Кобрына. Нарадзіўся 17 красавіка 1912 г. у в. Васільеўка Палтаўскай вобласці (Украіна). Прымаў удзел у вызваленчым паходзе Чырвонай арміі ў Заходнюю Украіну ў 1939 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з ліпеня 1941 г., ваяваў на Сталінградскім фронце, удзельнічаў у вызваленні Данбаса, Нікалаева, Нікапаля, Баранавічаў, Брэста, Кобрына, узяцці Кёнігсберга. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, медалямі. Пасля вайны жыў і працаваў у Кобрыне. Рашэннем Кобрынскага гарадскога Савета народных дэпутатаў № 237 ад 15 верасня 1987 г. Мілаяніну Івану Фёдаравічу прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Кобрына».

**Долготович, Б. Д.** Милоянин Иван Федорович / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 31.

**Мілаянін Іван Фёдаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 244. – (Крутымі дарогамі вайны).

**Мілаянін Іван Фёдаравіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп’ютарны дызайн вокладкі : інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 23-24.

### *215 гадоў з дня нараджэння Напалеона Орды (1807)*

**Напалеон Орда** (1807-1883) – кампазітар, піяніст, педагог, пісьменнік, мастак, творчасць якога звязана з Беларуссю і Польшчай. Нарадзіўся 11 лютага 1807 г. у в. Варатынічы Пінскага павета (цяпер Іванаўскі раён). У 1866 г. Напалеон Орда быў арэставаны па падазрэнню ва ўдзеле ў паўстанні 1863-1864 гг. і пасаджаны ў Кобрынскі турэмны замак. Потым яму было дазволена пасяліцца ў сваякоў у маёнтку Малодава Кобрынскага павета. Напалеон Орда шмат вандраваў, маляваў архітэктурныя пейзажы Беларусі, у тым ліку і Кобрына.

**Мешечко, Е. Н.** Орда Наполеон / Е. Н. Мешечко // Путешествие по Беларуси. В краю Немана, Западного Буга и Припяти : путеводитель / Е. Н. Мешечко. - Брест, 2012. - С. 237.

**Орда Напалеон** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2015. – Т. 6. – С. 111.

**Орда Наполеон Матеуш Тадеуш** // Гордость земли белорусской = Pride of the belarusian land : [соотечественники, оставившие яркий след в истории человечества. - Минск, 2015. - С. 45, 46.

## *120 гадоў з дня нараджэння І. М. Падбярэзіна (1902)*

**Падбярэзін Ілья Міхайлавіч** нарадзіўся ў 1902 г. у г. Уладзікаўказ, Расія. Закончыў ваенныя акадэміі імя Фрунзе і Генеральнага штаба. Удзельнік Грамадзянскай вайны. У Вялікую Айчынную ваяваў на розных франтах. У ліпені 1944 г. на чале 692-га стралковага палка ўдзельнічаў у вызваленні Кобрына (полк атрымаў ганаровае найменне Кобрынскага). З 1963 г. у адстаўцы. Ганаровы грамадзянін Кобрына.

**Долготович, Б. Д**. Подберезин Иван Михайлович / Б. Д. Долготович // Почётные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. – Минск, 2008. – С. 132.

**Падбярэзін Ілья Міхайлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 237. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

**Падбярэзін Ілья Міхайлавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : гал. бібліёграф С. Д. Курачук. – Кобрын, 2018. – С. 24-25.

## *115 гадоў з дня нараджэння С. Ф. Панфілава (1907)*

**Панфілаў Сямён Фёдаравіч** нарадзіўся ў 1907 г. у в. Гайсава Верхнеуральскага раёна Чэлябінскай вобласці. У ліпені 1941 г. прызваны ў Чырвоную армію. 15 сакавіка 1943 г. прызначаны камандзірам 2-й роты атрада імя Чкалава, са студзеня 1944 г. камандзір атрада імя Малянкова партызанскай брыгады імя Чапаева. Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені, медалямі. Пасля вайны жыў і працаваў у Кобрыне.

**Панфілаў Сямён Фёдаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 216-217. – (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

## *65 гадоў з дня нараджэння П. С. Папроцкага (1957)*

**Папроцкі Пётр Сяргеевіч** - Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна. Нарадзіўся 10 чэрвеня 1957 г. у в. Мазуры Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. З 1981 г. працуе ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Грушаўскі рамонтна-механічны завод». З 12 лютага 1999 г. і па цяперашні час з'яўляецца дырэктарам прадпрыемства. Рашэннем Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў ад 10 студзеня 2020 г. № 86 «Аб прысваенні звання «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна» за выдатны асабісты ўклад у развіццё эканомікі раёна Папроцкаму Пятру Сяргеевічу прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».

**Бялоў, Д.** Слаўся, Кобрыншчына, працай людзей! / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2020.– 22 студзеня (№ 5). – С. 1-2. - За выдатны асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё раёна званне «Ганаровы грамадзянін Кобрыншчыны» дырэктару ААТ «Грушаўскі рамонтна-механічны завод» Пятру Папроцкаму.

**Семенов, С.** Мы беремся за любую работу / Сергей Семенов // Брестский калейдоскоп. – 2020. – № 3 (март). – С. 3 : фот. - За неоценимый личный вклад в развитие экономики Кобринщины директороу «Грушевкого РМЗ» П. С. Папроцкому присвоено звание «Почетный гражданин Кобринского района».

## *75 гадоў з дня нараджэння І. А. Пасвенчука (1947)*

**Пасвянчук Іван Аляксандравіч** - вынаходнік, доктар філасофіі ў галіне інфармацыйных тэхналогій (машынабудаванне). Нарадзіўся 13 красавіка 1947 г. у в. Лука Кобрынскага раёна. Яго незвычайны прыбор пад назвай рухавік, абаронены патэнтамі Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Беларусь і Еўразійскай патэнтнай арганізацыяй, здольны зрабіць фурор у галіне беларускага машынабудавання і авіяцыі. Міжнародная Акадэмія

Інфармацыйных Тэхналогій у 2014 г. узнагародзіла Пасвенчука Івана Аляксандравіча медалём М. С. Высоцкага.

**Пасвянчук Іван Аляксандравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 110-112.

**Посвенчук, И.** «Мои «двигатель» и «движитель» можно будет эксплуатировать в воздушном, водном, безвоздушном пространстве, а также в смешанном режиме без внесения существенных изменений в их конструкцию» / И. Посвенчук // Международная деловая газета. – 2015. - № 11-12. – С. 4. - Иван Посвенчук, изобретатель, доктор философии, профессор ПАКТ, награждён памятной медалью Героя Беларуси, академика М. С. Высоцкого.

**Савчук, М.** Необычный прибор – движитель / Маргарита Савчук // Кобрин- информ. – 2014. – 23 января – С. 7. - Ученая степень доктора философии в области информационных технологий в области машиностроения присвоена уроженцу д. Луки И. А. Посвенчуку.

### *90 гадоў з дня нараджэння Т. А. Сакалюк (1932)*

**Сакалюк Таццяна Антонаўна** (1932-2009) - Герой Сацыялістычнай Працы. Нарадзілася 23 красавіка 1932 г. у в. Хідры. Працоўную дзейнасць пачала ў родным калгасе «Зара» ў 1951 г. Выбіралася дэпутатам райсавета.

**Адамович, А.** Драгоценный сплав / А. Адамович // Земные звёзды : очерки о Героях Социалистического Труда Брестской области. - Минск, 1978. - С. 313-317.

**Соколюк Татьяна Антоновна** // Твои герои, Беларусь! Герои Социалистического Труда : биографический справочник. – Минск, 2014. – С. 207.

**Сакалюк Таццяна Антонаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 426. – (Вызначыліся працай).

**Сакалюк Таццяна Антонаўна** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 11-12.

### *100 гадоў з дня нараджэння Т. І. Самцовай (1922)*

**Самцова Таццяна Іванаўна** (1922–2003) - заслужаны настаўнік. Нарадзілася ў 1922 г. у в. Навіны Бярэзінскага раёна. У гады Вялікай Айчыннай вайны ў партызанскім атрадзе № 212 брыгады імя Караля. Працавала настаўніцай у сярэдніх школах Брэста, Беразіно, намеснікам дырэктара ў СШ № 5 г. Кобрына. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны ІІ ступені, медалямі «За боевые заслуги», «За доблестный труд». У сувязі з 30-годдзем Перамогі ў 1975 г. занесена ў кнігу Народнай славы Кобрынскага раёна. Званне «Заслужаны настаўнік» прысвоена ў 1976 г.

**Самцова Таццяна Іванаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 430 – (Вызначыліся працай).

**Самцова Таццяна Іванаўна** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 112.

**Самцова Татьяна Ивановна** // Кто есть Кто в Республике Беларусь : справочное издание. – Минск, 2005. – Т. 2. – С. 306.

### *90 гадоў з дня нараджэння І. Г. Саўчука (1932)*

**Саўчук Іван Георгіевіч** нарадзіўся ў 1932 г. у в. Ластаўкі. У 1957 г. прымаў удзел у асваенні цалінных і абложных зямель у Казахстане. З 1958 г. па 1992 г. працаваў машыністам экскаватараў Кобрынскай машынна-меліярацыйнай станцыі Галоўпалессевадбуда. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1971), іншымі ўзнагародамі.

**Саўчук Іван Георгіевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 428. – (Вызначыліся працай).

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. **Иван Георгиевич Савчук** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

### *115 гадоў з дня нараджэння В. С. Селівонік (1907)*

**Селівонік Васіліса Сямёнаўна** (1907-1990) – дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Нарадзілася 2 ліпеня 1907 г. у в. Літвінкі. Член Брэсцкага, сакратар Гродзенскага, Слонімскага, Пінскага акружнога камітэта КПЗБ. Дэлегат 2 з'езда КПЗБ (1935). Дэпутат Народнага сходу Заходняй Беларусі (1935). У Вялікую Айчынную вайну – удзельніца партызанскай барацьбы. Пасля вайны В. Селівонік на партыйнай і савецкай рабоце ў Брэсце. Аўтар успамінаў «В суровые годы подполья» (1958), «Годы испытаний и мужества» (1973). На доме, у якім жыла В. С. Селівонік, усталявана мемарыяльная дошка. Ганаровы грамадзянін г. Брэста (1969 г.).

**Долготович, Б. Д.** Селивоник Василиса Семёновна / Б. Д. Долготович // Почётные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. – Минск, 2008. – С. 13.

**Селівонік Васіліса Сямёнаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 228-230.

### *100 гадоў з дня нараджэння К. Д. Семянюк (1922)*

**Семянюк Кацярына Дзям'янаўна** (1922–2013) - заслужаны настаўнік. Нарадзілася 29 кастрычніка 1922 г. у в. Качышча Ельскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыла Мазырскі настаўніцкі інстытут (1946). У гады вайны ў партызанскім атрадзе «Бальшавік». З 1946 г. працавала настаўніцай у няпоўнай сярэдняй школе в. Залессе, у 1946-1962 гг. - завуч Залескай сярэдняй школы. У 1962-1985 гг. - настаўніца ў СШ № 5 і СШ № 2 г. Кобрына. Узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені. Званне «Заслужаны настаўнік» прысвоена ў 1970 г.

**Семянюк Кацярына Дзям'янаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. – 430. - (Вызначыліся працай).

**Семянюк Кацярына Дзям'янаўна** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 112-113.

**Семенюк Екатерина Демьяновна** // Кто есть Кто в Республике Беларусь : справочное издание / под ред. И. В. Чекалова. – Минск, 2005. – Т. 2. – С. 311.

**Сіманава, І. Э.** Школьная адукацыя Кобрыншчыны ў даваенныя і першыя пасляваенныя гады / І. Э. Сіманава // Карані і кроны : гісторыя Кобрыншчыны: першая палова XX стагоддзя / [укладальнікі : Ю. А. Барысюк, А. А. Мезенцэва]. - Брэст, 2017. – С. 108-134.

Гл. на с. 131.

### *140 гадоў з дня нараджэння С. Ю. Сідарчука (1882)*

**Сідарчук Сямён Юльянавіч** (1882-1932) - архітэктар з багатай творчай спадчынай, якая захаваліся не толькі ў Кобрыне і Брэсце, але і ў Царскім Сяле пад Пецярбургам і ў гарадах Заходняй Украіны. Дзякуючы рэканструкцыі пачатку XX стагоддзя, гандлёвыя рады па вуліцы Інтэрнацыянальнай і ў раёне плошчы Свабоды г. Кобрына захавалі сваё

гістарычнае аблічча. Займаўся іх аднаўленнем наш зямляк, у свой час былы імператарскі архітэктар пры Мікалаю ІІ Сідарчук Сямён Юльянавіч. Яго архітэктурная спадчына сёння з'яўляецца здабыткам трох дзяржаў: Беларусі, Расіі і Украіны. Нарадзіўся 1 верасня 1882 г. у г. Кобрыне Гродзенскай губерні.

**Ильин, А.** Царский архитектор Семён / А. Ильин // Гістарычная брама. - 2011. - №1 (26).

**Глазов, В.** Архитектор Семен Сидорчук творил в Царском селе и Бресте-над-Бугом [Электронный ресурс] / В. Глазов. – Режим доступа: https://bit.ly/2ZxrGD3 - Дата доступа: 24.07.2020.

### *70 гадоў з дня нараджэння М. У. Смяховіча (1952)*

**Смяховіч Мікалай Уладзіміравіч** – педагог, навуковец. Нарадзіўся 18 студзеня 1952 г. у в. Дзівін Кобрынскага раёна. Кандыдат гістарычных навук (1992), дацэнт (1995). Аўтар больш 100 навуковых прац, у тым ліку 6 манаграфій (5 у суаўтарстве). Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя беларускай дзяржаўнасці, сацыяльна-палітычная гісторыя Беларусі канца XVIII - пачатку XXI ст., тэарэтыка-метадалагічныя праблемы гістарычнага пазнання.

**Смяховіч, М. У.** Нацыянальная ідэя беларусаў у XX стагоддзі : гістарычны аналіз праблемы / М. У. Смяховіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 1998. - № 3. – С. 20-25.

**Смяховіч Мікалай Уладзіміравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 441. – (Імі ганарацца землякі).

**Смяховіч Мікалай Уладзіміравіч**. Вядомыя людзі, ураджэнцы в. Дзівін // Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні : гісторыка-краязнаўчы нарыс да 550-годдзя з часу першага ўпамінання в. Дзівін Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслуг. і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 27-28.

**Смяховіч Мікалай Уладзіміравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслуг. і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 132-134.

### *75 гадоў з дня нараджэння А. А. Стральчонка (1947)*

**Стральчонак Алег Анатольевіч** (1947-2010) – беларускі вучоны, хімік, доктар хімічных навук (1983), акадэмік Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі (1994 г.; член-карэспандэнт з 1989 года). Нарадзіўся 18 кастрычніка 1947 г. у г. Кобрыне Брэсцкай вобласці. Аўтар больш 180 навуковых прац, 35 вынаходстваў. Шматграннай і актыўнай была грамадская дзейнасць А. А. Стральчонка. Удзельнічаў у працы Камітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі, Рэспубліканскай навуковай рады па праблемах прагназавання навукова-тэхнічнага прагрэсу пры камісіі Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь, уваходзіў у склад рэдакцыйнай калегіі часопіса «Известия НАН Беларуси», серыя «Химические науки».

**Мешечко, Е. Н**. Стрельчонок Олег Анатольевич / Е. Н. Мешечко // Путешествие по Беларуси. В краю Немана, Западного Буга и Припяти : путеводитель / Е. Н. Мешечко. - Брест, 2012.- С. 228.

**Стральчонак Алег Анатольевіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2002. – Т. 15. - С. 198.

**Стрельчёнок Олег Анатольевич** // Республика Беларусь : энциклопедия : в 7 т. – Минск, 2008. – Т. 7. - С. 133.

**Стрельчёнок Олег Анатольевич** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т. 1. Брестская область: в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 387.

**Стральчонак Алег Анатольевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 136-138.

### *110 гадоў з дня нараджэння С. Д. Страчука (1912)*

**Страчук Сцяпан Дзмітрыевіч** (1912–1988). Нарадзіўся ў 1912 г. у в. Лушчыкі. У 1933 г. уступіў у арганізацыю КСМЗБ у роднай вёсцы, пазней выбраны яе сакратаром. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР (верасень 1939) старшыня часовага сельскага камітэта, са студзеня па 22 чэрвеня 1941 г. - старшыня сельсавета ў в. Жухаўцы. У Вялікую Айчынную вайну знаходзіўся на ваенна-будаўнічых работах у савецкім тыле. З 1947 г. працаваў загадчыкам гандлёвага аддзела Кобрынскага райвыканкама, з 1951 г. і да выхаду на пенсію старшынёй калгаса.

**Страчук Сцяпан Дзмітрыевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 116. – (Удзельнікі рэвалюцыйных выступленняў на Кобрыншчыне (1921-1939).

### *75 гадоў з дня нараджэння У. І. Сухарава (1947)*

**Сухараў Уладзімір Іванавіч** – прэзідэнт Асацыяцыі «Інтэртрэйнінг», сустаршыня – выканаўчы дырэктар Міжнароднага форума «Сусветны вопыт і эканоміка Расіі». Нарадзіўся 14 жніўня 1947 г. у Маскве. З 1991 г. актыўна ўдзельнічае ў жыцці Кобрына, падрыхтоўцы і правядзенні гарадскіх святаў, праводзіць вялікую работу па прыцягненні інвестыцый для эканамічнага развіцця рэгіёна, яго прадпрыемстваў, устаноў. Прымаў актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні ў 2005 г. Міжнароднага інвестыцыйнага Форума «Кобрын-Інвест». У 2005 г. за вялікі асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё Кобрыншчыны, умацаванне дзелавых і сяброўскіх сувязей двух братэрскіх народаў Беларусі і Расіі У. І. Сухараву прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».

**Долготович, Б. Д.** Сухарев Владимир Иванович / Б. Д. Долготович // Почётные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. - С. 33.

**Неповторимый** колорит дружбы // Кобрынскі веснік. – 2007. – 25 ліпеня. – С. 1. - В августе 2005 г. за большой личный вклад в социально-экономическое развитие Кобринщины, укрепление связей двух братских народов Беларуси и России В. И. Сухарев удостоен звания Почетного гражданина Кобринского района.

### *100 гадоў з дня нараджэння І. В. Харытанюка (1922)*

**Харытанюк Іван Васільевіч** нарадзіўся ў 1922 г. у в. Забава. З чэрвеня 1942 г. да ліпеня 1944 г. сувязны партызанскіх атрадаў імя Фрунзе і імя М. М. Чарнака. Удзельнічаў у вызваленні Брэсцкай вобласці ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны медалямі.

**Харытанюк Іван Васільевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 226. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *70 гадоў з дня нараджэння І. А. Чароты (1952)*

**Чарота Іван Аляксеевіч** – беларускі літаратуразнавец, крытык, перакладчык. Член Саюза пісьменнікаў СССР, Беларусі (1985), доктар філалагічных навук (1998), прафесар (1999). Акадэмік Сербскай акадэміі навук і мастацтваў, Міжнароднай славянскай акадэміі навук, адукацыі, мастацтваў і культуры, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» (2003), Міжнароднай прэміі імя К. Астрожскага (Польшча, 1999), прэміі Саюза пісьменнікаў Сербіі (2000) і інш. Узнагароджаны ордэнам Прападобнага Сергія Раданежскага (2002). Кола

навуковых інтарэсаў І. А. Чароты ўключае пытанні літаратуры і культуры славянскіх народаў. Аўтар звыш 250 навуковых, навукова-метадычных і літаратурных прац. Нарадзіўся 16 верасня 1952 г. у в. Лышчыкі.

**Бовтрель, И. Г**.Чарота Иван Алексеевич / И. Г. Бовтрель // Республика Беларусь: энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2008. – Т. 7. - С. 494.

**Ляшук, В. Я.** [Іван Чарота] / В. Я. Ляшук, Г. М. Снітко // Літаратурная Берасцейшчына / В. Я. Ляшук, Г. М. Снітко. - Мінск, 2008. - С. 15, 271, 302..

**Трус, М. В.** Чарота Іван Аляксеевіч / М. В. Трус // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2003. – Т. 17. – С. 245 : фота.

**Чарота Иван Алексеевич** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 453.

**Чарота Іван Аляксеевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 444. – (Імі ганарацца землякі).

**Чарота Іван Аляксеевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 146-152.

### *90 гадоў з дня нараджэння І. П. Чэрніка (1932)*

**Чэрнік Ігар Паўлавіч** нарадзіўся 25 жніўня 1932 г. у в. Гарадзец. Закончыў Гродзенскае педагагічнае вучылішча (1968), Мінскі інстытут культуры (1983). За сваё жыццё Ігар Чэрнік стварыў пяць хораў: «Колас», хор хлопчыкаў у Антопалі, хор настаўнікаў у Камянцы, хор «Чарнічанка» ў Брэсцкім раёне і харавы калектыў «Галасы Палесся» ў Брэсце. Заслужаны работнік культуры (1975).

**Черник, И.** Песни сердца : сборник вокально-хоровых произведений / Игорь Черник. – Брест : Альтернатива, 2007. – 24 с.

**Чэрнік Ігар Паўлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 429. – (Вызначыліся працай).

**Чэрнік Ігар Паўлавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 123-124.

### *80 гадоў з дня нараджэння Г. М. Шутро (1942)*

**Шутро Ганна Мікалаеўна** (1942-2020) - Заслужаны работнік прамысловасці. Нарадзілася 7 студзеня 1942 г. у в. Зарой Дзятлаўскага раёна. Працавала дырэктарам Кобрынскага кансервавага завода. Адзначаны шматлікімі ўзнагародамі, сярод якіх - сярэбраны медаль ВДНГ СССР і ордэн Дружбы народаў (1986). У 1999 г. прысвоена званне «Заслужаны работнік прамысловасці Рэспублікі Беларусь».

**Шутро Ганна Мікалаеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 429. – (Вызначыліся працай).

**Шутро Ганна Мікалаеўна** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 126.

### *100 гадоў з дня нараджэння М. Ф. Якуніна (1922)*

**Якунін Мікалай Фёдаравіч** нарадзіўся ў 1922 г. у в. Рабкінскі Завод Чырвонаслабодскага раёна, Мардовія. У Вялікую Айчынную вайну да сакавіка 1943 г. на фронце. З восені 1943 г. партызан, потым палітрук 3-й роты атрада імя Чапаева. У студзені-ліпені 1944 г. камісар партызанскага атрада імя Паставалава брыгады імя Чапаева. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, сярэбраным крыжам Польскай Народнай Рэспублікі «Virtuti Militari» («Ваеннай доблесці») II ступені, медалямі. Пасля вайны працаваў у Кобрынскім райкаме ЛКСМБ, у рачной гаспадарцы Кобрына, Брэста.

**Якунін Мікалай Фёдаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 218. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *130 гадоў з дня нараджэння І. Ф. Яшчука (1892)*

**Яшчук Іван Фёдаравіч** нарадзіўся ў 1892 г. у в. Навасёлкі. У 1915 г. мабілізаваны ў царскую армію, з 1917 г. у Чырвонай арміі. У 1941-1945 гг. - на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Вайну закончыў у Венгрыі ў званні капітана. Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалём «За абарону Севастопаля» і інш.

**Яшчук Іван Фёдаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 246. – (Яны прайшлі дарогамі вайны).

# Юбілейныя даты рэлігійных устаноў

### *Свята-Пакроўскай царкве ў в. Акцябр (1937)- 85 гадоў*

**Свята-Пакроўская царква** ў в. Акцябр знаходзіцца на ўскраіне вёскі. Пабудавана ў 1937 г. Помнік народнага дойлідства. Царква ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

**Акцябрская** Пакроўская царква // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2013. – Т. 1. – С. 101.

**Свята-Пакроўская** царква ў в. Акцябр // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 468. – (Архітэктурная спадчына Кобрыншчыны).

**Культавае** дойлідства. Акцябр. Свята-Пакроўская царква // Захавальнікі гісторыі роднага краю : турыстычна-бібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 42.

### *Царкве Прападобнай Параскевы Сербскай у в. Балоты (1882) – 140 гадоў*

**Царква Прападобнай Параскевы Сербскай у в. Балоты** пабудавана ў 1882 г. паводле праекта, складзенага ў 1880 г. інжынерам Ф. Афанасьевым. Помнік драўлянага дойлідства з рысамі стылю класіцызму. Уключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

**Балоцкая** царква Параскевы Пятніцы // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2013. – Т. 1. – С. 422.

**Царква** Прападобнай Параскевы Сербскай у в. Балата // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 465. – (Драўлянае царкоўнае дойлідства).

**Культавае** дойлідства. Балоты. Царква Прападобнай Параскевы Сербскай // Захавальнікі гісторыі роднага краю : турыстычна-бібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 43-44.

### *Свята-Прачысценскай царкве ў в. Дзівін (1902) – 120 гадоў*

**Свята-Прачысценская царква** знаходзіцца ў цэнтры в. Дзівін. Узведзена ў 1902 г. Помнік архітэктуры псеўдарускага стылю. Царква ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

**Дзівінская** царква Раства Багародзіцы // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2013. – Т. 3. – С. 395.

**Марчук, Н.** Православные храмы Дивина / Нина Марчук // Кобрин-информ. – 2014. – 16 октября. – С. 11.

**Культавае** дойлідства. Дзівін. Свята-Прачысценская царква // Захавальнікі гісторыі роднага краю : турыстычна-бібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 49-50.

### *Свята-Троіцкай царкве ў в. Казішча (1927) - 95 гадоў*

**Свята-Троіцкая царква** размешчана каля могілак на паўночна-ўсходняй ускраіне вёскі Казішча. Пабудавана ў 1927 г. Царква ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

**Свята-Троіцкая** царква ў в. Казішча // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 468. – (Драўлянае царкоўнае дойлідства).

**Культавае** дойлідства. Казішча. Свята-Троіцкая царква // Захавальнікі гісторыі роднага краю : турыстычна-бібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 50.

### *Царкве ў імя святога апостала і евангеліста Лукі ў в. Лука (2007) – 15 гадоў*

**Царква ў імя святога апостала і евангеліста Лукі** ў в. Лука пабудавана і асвячона 31 кастрычніка 2007 г.

**Культавае** дойлідства. Лука. Царква ў імя святога апостала і евангеліста Лукі // Захавальнікі гісторыі роднага краю : турыстычна-бібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 53-54.

**Лесик, И.** Через тернии – к храму / Ирина Лесик // Кобрынскі веснік. – 2015. – 3 студзеня. – С.10. - О Свято-Лукинской церкви.

# Юбілейныя даты прадпрыемстваў, устаноў горада і раёна

***Філіялу «Кобрынскае вытворчае ўпраўленне» вытворчага ўпраўлення «Кобрынгаз» вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Брэстаблгаз» (1962) – 60 гадоў***

13 сакавіка 1962 г. была створана Кобрынская эксплуатацыйна-мантажная кантора Брэсцкага трэста газіфікацыі для газазабеспячэння Кобрына і Кобрынскага раёна. 1 жніўня 1975 г. кантора рэарганізавана ў Кобрынскае міжраённае вытворчае ўпраўленне газавай гаспадаркі «Кобрынміжрайгаз», у склад якога ўвайшлі Драгічынскі і Жабінкаўскі цэхі. У 1987 г. Драгічынскі і Жабінкаўскі цэхі аддзяліліся ад ВУ «Кобрынміжрайгаз», а прадпрыемства было пераўтворана ў Кобрынскае раённае вытворчае ўпраўленне газавай гаспадаркі «Кобрынрайгаз» Брэсцкага абласнога прадпрыемства газавай гаспадаркі «Брэстаблгаз». 1 студзеня 2005 г. да Кобрынрайгазу далучаны Маларыцкі цэх. У жніўні 2007 г. Кобрынскае РВУ «Кобрынрайгаз» перайменавана ў Кобрынскае міжраённае вытворчае ўпраўленне газавай гаспадаркі «Кобрынміжрайгаз». 1 верасня 2015 г. у выніку рэарганізацыі прадпрыемства і аптымізацыі вытворчых працэсаў Пружанскае раённае вытворчае ўпраўленне газавай гаспадаркі «Пружanырайгаз» далучана да МВУ «Кобрынміжрайгаз»; затым абодва трансфармаваліся ў філіял «Кобрынскае вытворчае ўпраўленне» ВУ «Кобрынгаз» ВРУП «Брэстаблгаз».

**ПУ «Кобрингаз»** // Брестоблгаз. Производственное республиканское унитарное предприятие. – Вечерний Гомель-Медиа, 2020. – С.198-211.

**Елизарова, Ж**. С нами всегда тепло! / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2020. — 5 верасня (№ 69). — С. 1—2 : фот. - О работе коллектива производственного управления «Кобрингаз».

**Белов, Д.** ПУ «Кобрингаз»: в каждый дом — с уютом и теплом / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2018. — 1 верасня. — С. 4. - В канун профессионального праздника о работе ПУ «Кобрингаз».

***Вытворчаму ўнітарнаму прадпрыемству «Брэсцкія традыцыі» (Кобрынскі мясакамбінат) (1997) - 25 гадоў з часу заснавання***

**Кобрынскі мясакамбінат** заснаваны ў 1997 г. Абсталяванне прадпрыемства дазваляе перапрацоўваць айчынную сыравіну, забяспечваць якасную комплексную перапрацоўку мяса. Асноўная прадукцыя: каўбасы паўвэнджаныя, варана-вэнджаныя, вараныя, сыравэнджаныя, паштэты, паўфабрыкаты, марынаваны шашлык у вядзерцах, фарш, пельмені. У свой час ААТ «Кобрынскі мясакамбінат» – лаўрэат прэміі ўрада Рэспублікі Беларусь у галіне якасці, лаўрэат прэміі Брэсцкага аблвыканкама ў галіне якасці, пераможца конкурсаў «Лепшая прадукцыя года», «Густ», «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь», рэспубліканскай акцыі «Алімпійская якасць»; узнагароджаны дыпломам за актыўны ўдзел у гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве Беларусі і Расіі. 27 лістапада 2012 г. Кобрынскі мясакамбінат быў далучаны да ААТ «Брэсцкі мясакамбінат» і стаў філіялам аднаго з буйнейшых прадпрыемстваў мясаперапрацоўчай прамысловасці Рэспублікі Беларусь. З 2016 г. - вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Брэсцкія традыцыі».

**Кобринский мясокомбинат** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 473-474.

**Кобрынскі мясакамбінат** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 410. – (З гісторыі прадпрыемстваў Кобрына).

**ОАО** «Кобринский мясокомбинат» // Брестчина, устремлённая в будущее. - Брест, 2009. – С. 271.

**Пашкович, Л.** Переработка — приоритетное направление / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2018. — 17 лістапада. — С. 4. - В ПУП «Брестские традиции» вышли на самый большой объем произведенной продукции.

**Дубина, Л.** Секрет успеха «Брестских традиций» / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2016. - 16 сакавіка. - С. 2.

### *Адкрытаму акцыянернаму таварыству «Кобрынская птушкафабрыка» (1962) - 60 гадоў з часу стварэння*

**Кобрынская птушкафабрыка** - адна са старэйшых птушкагадоўчых прадпрыемстваў Рэспублікі Беларусь, даволі вядомая на абшарах былога Савецкага Саюза. Заснавана 1 снежня 1962 г. на базе інкубацыйна-племяннай станцыі і калгаса «Расія». З 1969 г. у складзе Баранавіцкага вытворчага аб'яднання, з 1993 г. у падпарадкаванні рэспубліканскага аб'яднання «Белптушкапрам». Асноўныя кірункі дзейнасці птушкафабрыкі - вытворчасць і рэалізацыя яек, мяса птушкі, яечнага меланжу і бялку, каўбасных вырабаў, паўфабрыкатаў і кансерваў з мяса птушкі, вытворчасць травяной мукі, сухіх бялковых кармоў. Мае фірменныя магазіны, свой машынна-трактарны парк. У 2001 г. да фабрыкі далучылі сельскія гаспадаркі «1 Мая» і «Патрыкі», што значна пашырыла ўласныя сельскагаспадарчыя ўгоддзі птушкафабрыкі. З 17 снежня 2001 г. птушкафабрыка «Кобрынская» перайменавана ў РУСВП «Кобрынская птушкафабрыка». З 22 лютага 2005 г. РУСВП «Кобрынская птушкафабрыка» пераўтворана ў адкрытае акцыянернае таварыства. У 2011 г. ААТ «Кобрынская птушкафабрыка» далучана да ААТ «Баранавіцкая птушкафабрыка». У 2015 г. у адносінах да птушкафабрыкі эканамічны суд вобласці адкрыў конкурсную вытворчасць па справе пра банкруцтва, але гэта не стала прыгаворам для прадпрыемства. Сёння птушкафабрыка працуе ва ўмовах фінансавага аздараўлення.

**Кобринская** птицефабрика // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 465-466.

**Птушкафабрыка** «Кобрынская» // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002.- С. 409.

**Кондрашук, Н.** Кобринской птицефабрике - 50 / Н. Кондрашук // Кобрин-информ. - 2012. - 6 декабря. - С. 2.

### *Яроміцкай ПМК-52 (1952) -65 гадоў з часу стварэння*

На падставе пастановы Савета Міністраў БССР і ЦК КП (б) Беларусі ад 8 студзеня 1952 г. № 14 была створана **Кобрынская машынна-меліярацыйная станцыя**, якая пачала функцыянаваць з ліпеня 1952 г.

**Лукашик, П. И.** Прошлое и настоящее / П. И. Лукашик. – Брест : ОАО «Брестская типография», 2002. – 44 с.

Пятидесятилетию Ерёмичской ПМК-52 посвящается.

### *Філіялу нафтаперапампоўваючай станцыі «Кобрын» адкрытага акцыянернага таварыства «Гомельтранснафта «Дружба» (1967) – 55 гадоў*

15 студзеня 1967 г. на беларускім участку нафтаправода «Дружба» з'явілася **нафтаперапампоўваючая станцыя «Кобрын».** Участак НПС «Кобрын» працягваецца да беларуска-польскай дзяржаўнай мяжы і забяспечвае транспарціроўку вуглевадароднай сыравіны заходнееўрапейскім спажыўцам. Усё пачыналася з першай чаргі трубаправода дыяметрам 630 мм; пазней была пракладзена і пачала дзейнічаць другая нітка трубаправода дыяметрам 820 мм і трэцяя нітка трубаправода дыяметрам 720 мм. Цяпер НПС «Кобрын» - гэта дзве помпавыя станцыі, помпавая пеннага пажаратушэння, ачышчальныя збудаванні, электрападстанцыя, вузел сувязі, кацельня і іншыя збудаванні, якія забяспечваюць стабільную працу ўсёй нафтаперапамповачнай станцыі.

**Бакун, Е.** В ногу со временем / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2019. — 23 лістапада (№ 91). — С. 3 : фот. - Нефтеперекачивающая станция (НПС) «Кобрин» вместе с партнерами отмечает 55-летие ОАО «Гомельтранснефть Дружба».

**Бакун, Е.** «Черное золото» в руках кобринчан / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2018. — 29 жніўня. — С. 3. – О работе коллектива нефтеперекачивающей станции «Кобрин».

**Гром, А.** Стабильность нефтяной артерии / Анна Гром // Кобрынскі веснік. - 2010. - 2 студзеня. - С. 2. - Нефтеперекачивающая станция «Кобрин» - последнее звено на территории Беларуси в цепочке нефтеперекачивающих станций нефтепровода «Дружба».

# Юбілеі медыцынскіх устаноў

## *Кобрынскай раённай арганізацыі Чырвонага Крыжа (1947) - 75 гадоў*

**Пашкович, Л.** Контейнер для Красного Креста / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2018. — 8 жніўня. — С. 4. - В Кобрине появился специальный контейнер для сбора вещей малоимущим.

**Благотворительность** набирает обороты // Кобрынскі веснік. – 2016. – 6 студзеня. – С. 4. – Состоялась отчётно-выборная конференция районной организации Красного Креста.

**Занько, Н.** Дабрачыннасці шмат не бывае / Н. Занько // Кобрынскі веснік. - 2012. - 19 мая. - С. 3.

## *Арэхаўскай амбулаторыі ўрача агульнай практыкі (1987) - 35 гадоў з часу адкрыцця*

**Арэхаўская амбулаторыя** размешчана ў зручным памяшканні на першым паверсе жылога дома. Радыус абслугоўвання тры кіламетры. Агульная плошча складае 247,7 квадратных метраў. Амбулаторыя адкрыта ў 1987 г. З 2004 г. працуе як амбулаторыя агульнай практыкі. Ёсць рэгістратура, фізіятэрапеўтычны, працэдурны кабінеты, кабінет здаровага дзіцяці, лабараторыя, аптэка.

**Сацук, А.** Красота тоже лечит / Алексей Сацук // Кобрынскі веснік. - 2008. - 9 ліпеня. - С. 3. - О коллективе амбулатории пос. Ореховский.

## *Навасёлкаўскай участковай бальніцы (1947) - 75 гадоў з часу адкрыцця*

У бальніцы два аддзяленні: сястрынскага догляду, дзе часова пражывае каля 15 чалавек, і тэрапеўтычнае, разлічанае на 10 месцаў, куды паступаюць пацыенты з рознымі захворваннямі.

**Бакун, А.** Лекарства для души / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. – 2017. – 19 красавіка. – С. 3.

**Патоня, В.** Аўтарытэт навасёлкаўскіх медыкаў / Вікторыя Патоня // Кобрынскі веснік. – 2007. – 16 чэрвеня. – С. 1.

**В 50 лет** не дали умереть// Вечерний Брест. – 1997. – 19 августа. – С. 1. - Участковая больница в Новосёлках празднует 50-летие.

## *Хідрынскай амбулаторыі ўрача агульнай практыкі (1987) - 35 гадоў з часу адкрыцця*

**Хідрынская амбулаторыя** адкрыта ў 1987 г. Па прынцыпу ўрача агульнай практыкі працуе з 1 лютага 2005 г. У амбулаторыі можна на месцы зрабіць электракардыяграму

сэрца, правесці шэраг іншых неабходных аналізаў. Функцыянуюць кабінет прыёму ўрача агульнай практыкі, стаматалагічны кабінет, кабінет акушэркі, працэдурны кабінет, лабараторыя, фізіятэрапеўтычны кабінет. Для аказання медыцынскай дапамогі на даму і правядзення прафілактычных аглядаў ёсць аўтамабіль.

**Елизарова, Ж.** С заботой о здоровье / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2018. — 5 мая. — С. 7.

В Хидринской амбулатории врача общей практики работают люди беззаветно преданные своей профессии.

**Сідарук, І.** Тут заўсёды гатовы аказаць дапамогу / Ігар Сідарук ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2013. - 16 кастрычніка. - С. 3.

# Юбілейныя даты ўстаноў адукацыі

### *Дзяржаўнай установе адукацыі«Астроміцкая сярэдняя школа» (1912) – 110 гадоў*

Першае згадванне пра школу ў в. Астромічы адносіцца да 1912 г. Да 1939 г. выкладанне ўсіх прадметаў у школе вялося на польскай мове. Пасля ўз'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі ў вёсцы быў пабудаваны новы будынак школы. У 1946 г. адкрылася пачатковая школа, якая размяшчалася ў прыватнай хаце. У 1973 г. пад памяшканне школы быў аддадзены новы будынак, і з гэтага часу школа атрымлівае статус васьмігадовай. У лістападзе 1984 г. пачалося будаўніцтва новай сярэдняй школы. 30 жніўня 1985 г. школа расчыніла свае дзверы перад 306 вучнямі.

**Грышкевіч, С.** Першая «Школа міру» на Брэстчыне / Сяргей Грышкевіч // Настаўніцкая газета. - 2019. — 6 кастрычніка. — С. 4 : фот. - Астроміцкая сярэдняя школа Кобрынскага раёна атрымала ганаровы статус «Школа міру».

**Муха, Ф. «**Школа мира» в Остромичах / Федор Муха // Заря. - 2019. — 2 октября. — С. 19 : фот. - Первой на Брестчине Остромичская средняя школа получила почетный статус «Школа мира».

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Батчынская сярэдняя школа» (1937) - 85 гадоў*

Пачатак дзейнасці - 1 верасня 1937 г. У 1979 г. адкрылася Батчынская васьмігадовая школа. У 1985 г. школа стала сярэдняй.

**Бакун, Е.** Берег детства / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2019. — 24 жніўня. — С. 4 : фот. - Учащиеся Батчинской СШ не первый год проводят каникулы в передвижном туристско-краеведческом палаточном лагере.

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Рынкаўская базавая школа» (1927) – 95 гадоў*

Па дадзеных архіва г. Брэста ў вёсцы Рынкі школа пачала дзейнічаць у 1927 г. Была адкрыта двухкласная агульнаадукацыйная пачатковая школа з сумесным навучаннем дзяўчынак і хлопчыкаў. Да 1955 г. школа была сямігадовай, з 1955 г. стала сярэдняй.

**Тимошук, А.** Ее второе имя Румгерд / Анна Тимошук // Кобрынскі веснік. - 2016. - 23 красавіка. - С. 4. - Учитель истории Рынковской средней школы Ю. Воронина - активная участница клуба военно-исторической реконструкции «Перунова кола».

**Пятроўская, М.** Добры пачатак / М. Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 1997. – 29 студзеня. – С. 1.

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Яслі-сад № 19 г. Кобрына» (1987) – 35 гадоў*

**Яслі-сад № 19 г. Кобрына** былі адкрыты ў 1987 г. Кобрынскай прядзільна-ткацкай фабрыкай «Ручайка», у 2002 г. перададзены на баланс упраўлення адукацыі Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта.

**Лесик, И.** Лоскутная фигурка - от забавы к истории / Ирина Лесик // Кобрынскі веснік. - 2014. - 26 красавіка. - С. 12. - В ГУО «Ясли-сад № 19» г. Кобрина уделяется внимание приобщению детей к истокам культуры народа через игрушку - народную куклу.

**Позади** - 25! // Кобрин-информ. - 2012. - 15 ноября. - С. 2. - Состоялся праздничный концерт в «Ясли-сад № 19», посвящённый 25-летию учреждения.

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Стрыгаўскі дзіцячы сад-сярэдняя школа» (1957) - 65 гадоў*

У 1954 г. пачалося будаўніцтва новага двухпавярховага будынка на 300 пасадачных месцаў, у якім школа размяшчаецца ў цяперашні час. У 1957 г. новы будынак школы прыняў сваіх першых вучняў. За гады існавання пройдзены доўгі шлях развіцця ад сямігадовай школы з польскай мовай выкладання да вучэбна-педагагічнага комплексу «дзіцячы сад-сярэдняя школа» з мая 2008 г.

**Васюк, Н.** Песня из детства // Кобрин-информ. - 2007. - 22 ноября. - С. 7. - Стриговской СШ - 50 лет.

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Імянінскія яслі-сад» (1982) – 40 гадоў*

Установа адукацыі размешчана на тэрыторыі Буховіцкага сельскага савета. Адкрыта ўстанова рашэннем Кобрынскага райвыканкама Брэсцкай вобласці ў 1982 г. Яслі-сад функцыянуюць у рэжыме пяцідзённага працоўнага тыдня. З 2012 г. адкрыта група адаптацыі для дзяцей ад 1 года да 3 гадоў на бясплатнай аснове.

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Залескія яслі-сад» (1977) – 45 гадоў*

Фунцыянуе з 1977 г. Да 1994 г. установа знаходзілася ў ведамасным падпарадкаванні калгасу імя Суворава, сёння - у ведамстве ўпраўлення адукацыі Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта.

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Яроміцкі дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці» (1972) – 50 гадоў*

Установа адкрыта ў 1972 г. З 2009 г. з'яўляецца юрыдычнай асобай. 24 сакавіка 2017 г. рашэннем Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта дзяржаўная ўстанова адукацыі «Яроміцкія яслі-сад» перайменаваны ў дзяржаўную ўстанову адукацыі «Яроміцкі дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці». Установа дашкольнай адукацыі разлічана на 110 месцаў.

**Елизарова, Ж.** Чтобы зажечь других, нужно гореть самому / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2018. — 5 снежня. — С. 1. - ГУО «Еремичский дошкольный центр развития ребенка» занимается нововведениями и работает в «режиме развития».

**Бич, Т.** Еремичский дошкольный центр развития ребенка / [Татьяна Бич ; беседовала] Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2017. — 12 октября. — С. 2. - Решением Кобринского райисполкома от 24 марта 2017 г. ГУО «Еремичские ясли-сад» переименованы в ГУО «Еремичский дошкольный центр развития ребенка».

**Бич, Т.** «Наше дошкольное образование уникально» / Татьяна Бич ; [беседовал] Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2017. — 7 кастрычніка. — С. 3. - Интервью с заведующей ГУО «Еремичский дошкольный центр развития ребенка».

**Грышкевіч, С.** Сацыякультурны цэнтр вёскі / Сяргей Грышкевіч // Настаўніцкая газета. - 2016. — 15 кастрычніка. — С. 8. - Аб рабоце Яроміцкага яслі-сада.

**Ярмошук, Н.** Награды от министра / Николай Ярмошук // Заря. - 2016. - 29 ноября. - С. 4. - Еремичский ясли-сад Кобринского района занял второе место в областном конкурсе творческих работ «Безопасное детство».

## *Дзіцячаму саду «Сонейка» СВК «Узыходзячая зара» в. Хідры (1982) – 40 гадоў з часу адкрыцця*

У прыстасаваным памяшканні жылога дома ў 1982 г. адкрыта адна група дзіцячага сада. У 1985 г. пабудаваны новы будынак.

**Сідарук, І.** Прастор і асалода для дзятвы / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2013. — 21 кастрычніка. — С. 3. - З радасцю наведваюць Хідрынскі дзіцячы сад «Сонейка» яго выхаванцы.

## *Дзяржаўнай установе адукацыі «Кобрынскі прафесійна-тэхнічны каледж выяўленчага мастацтва і народных мастацкіх промыслаў» (1982) - 40 гадоў*
## *Кобрынскі політэхнічны каледж (з 2014)*

Заснавана ў 1982 г. як тэхнічнае вучылішча народных мастацкіх промыслаў па падрыхтоўцы рабочых высокай кваліфікацыі для мастацкіх прадпрыемстваў, аб'яднанняў, майстэрняў Брэсцкай вобласці і ўсёй рэспублікі. У 1996 г. вучылішчу нададзены статус вышэйшага. У ім ажыццяўляецца многаступеньчатая мадэль навучання. 19 жніўня 2013 г. на базе Кобрынскага каледжа будаўнікоў быў утвораны Кобрынскі політэхнічны каледж, у сакавіку 2014 г. у склад новай навучальнай установы ўвайшоў Кобрынскі дзяржаўны мастацкі прафесійна-тэхнічны каледж.

**Букач, А.** Учеба и творчество / А. Букач // АПК: курсом ускорения. - Минск, 1988. – С. 191-193.

**Кобринское** СПТУ № 105 : [буклет]. - Пинск, 1988.

**Бялоў, Д.** Каб не згубілася майстэрства, каб не прапала хараство / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2011. - 3 верасня. - С. 10.

## *Дзяржаўнай установе адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр экалогіі, турызму і краязнаўства» (1967) -55 гадоў*

З пачаткам руху юннатаў, які развярнуўся ў савецкі час, у г. Кобрыне ў снежні 1967 года на базе сярэдняй школы СШ № 1 была створана **станцыя юных натуралістаў**. У 1980 г. юннатам быў прадстаўлены навучальны комплекс, які складаўся з вучэбнага корпуса, 2 цяпліц. З 1994 г. станцыя юных натуралістаў перайменавана ў Дом юных натуралістаў, з верасня 2005 г. - у Кобрынскі раённы эколага-біялагічны цэнтр дзяцей і юнацтва. З 2019 г. эколага-біялагічны цэнтр дзяцей і юнацтва перайменаваны ў Кобрынскі раённы цэнтр экалогіі, турызму і краязнаўства.

**Савчук, М.** От внешкольных занятий к будущей профессии / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. – 2020. – 3 декабря (№ 49). – С. 4. - Уже 27 лет успешно руководит Кобринским районным центром экологии, туризма и краеведения Л. Строчук.

**Романюк, А**. Сохрани и преумножь / Анастасия Романюк // Кобрин-информ. - 2020. — 5 ноября (№ 45). — С. 3 : фот. - Кобринский районный центр экологии, туризма и краеведения проводит много мероприятий, направленных на экологическое воспитание.

**Шемчук, О. В**. Энергия солнца — Кобрину / Ольга Шемчук ; фото из архива центра // Родная природа. - 2020. - № 9. - С. 22-23 : фот. - О работе Кобринского районного центра экологии, туризма и краеведения.

**Савчук, М.** Теперь мы — экологи, туристы и краеведы / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2019. — 15 августа (№ 33). — С. 3. - ГУО «Кобринский районный центр экологии, туризма и краеведения» становится многопрофильной площадкой для занятий детей и подростков.

**Бакун, А.** У іх руках — прыроды дар каштоўны / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. — 13 снежня. — С. 2. - Кобрынскі раенны эколага-біялагічны цэнтр дзяцей і юнацтва адсвяткаваў 50-гадовы юбілей.

**Пальто, К.** Эколого-биологическому центру - 50 / Ксения Пальто // Кобрынскі веснік. – 2017. – 9 снежня. – С. 1, 3.

**Симонова, И.** Призвание / Ирина Симонова, Надежда Прокопович // Кобрин-информ. - 2017. — 13 июля. — С. 2. - История создания Кобринского районного эколого-биологического центра.

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр тэхнічнай творчасці навучэнцаў» (1977) - 45 гадоў*

**Кобрынскі раённы ЦТТН** - установа дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Установа створана ў 1977 г. як Кобрынская станцыя юных тэхнікаў.

**Пальто, К.** Занятие с перспективой на будущее / Ксения Пальто // Кобрынскі веснік. - 2017. - 5 красавіка. - С. 4. - В Кобринском районном центре технического творчества учащиеся не просто занимаются интересным делом, но и инвестируют полезные навыки в свое будущее.

### *Раённай фізкультурна-аздараўленчай установе «Атлант» (1997) – 25 гадоў з часу стварэння*

**Гарадскі цэнтр «Атлант»** па арганізацыі актыўнага адпачынку, заняткаў фізічнай культурай, спортам па месцы жыхарства насельніцтва створаны рашэннем Кобрынскага гарвыканкама ад 21.10.1997 г. № 568. У 2000 г. цэнтр пеатвораны ў гарадскую фізкультурна-аздараўленчую ўстанову «Атлант» (рашэнне гарвыканкама № 567). У 2002 г. пры аб'яднанні горада Кобрына і Кобрынскага раёна ў адну адміністрацыйную адзінку ўстанова была пераўтворана ў раённую фізкультурна-аздараўленчую ўстанову «Атлант». Аказвае фізкультурна-аздараўленчыя і турыстычныя паслугі.

**Елизарова, Ж**. QR-код расскажет всю историю / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2017. - 18 кастрычніка. - С. 5. - Специалисты РФОУ «Атлант» разработали специальный штрих-код, благодаря которому с помощью программы-распознавателя можно прочитать зашифрованную информацию об исторических объектах Кобринщины.

**Бакун, Е.** За красотой и здоровьем — в «Атлант» / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2016. — 29 кастрычніка. — С. 4. - В РФОУ «Атлант» созданы все условия для занятий спортом, организуют экскурсию на любой вкус и для любого возраста.

# Юбілейныя даты ўстаноў культуры і ўстаноў адукацыі ў сферы культуры

### *Узорнай цыркавой студыі «Сонейка» ўстановы культуры «Кобрынскі Палац культуры» (1982) - 40 гадоў*

Створана ў 1982 г. пры раённым Доме культуры, з 2009 г працуе пры Палацы культуры. Першым кіраўніком была В. Талстапятава. Званне «ўзорны аматарскі калектыў» прысвоена ў 1982 г.

**Кобрынская** ўзорная цыркавая студыя «Сонейка» // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2013. – Т. 4. – С. 515-516.

**Пракапюк, А. Я.** Цыркавая студыя «Сонейка» / А. Я. Пракапюк // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 506. – (Народныя і дзіцячыя ўзорныя калектывы).

### *Студыі дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Натхненне» ўстановы культуры «Кобрынскі Палац культуры» (1992) – 30 гадоў*

Створана ў 1992 г. пры раённым Доме культуры, з 2009 г працуе пры Палацы культуры. Званне «ўзорны» аматарскі калектыў прысвоена ў 1999 г.

**Кобрынская** студыя дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Натхненне» // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [ у 6 т.]. – Мінск, 2013. – Т. 4. – С. 515.

**Пракапюк, А. Я.** Студыя дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Натхненне» / А. Я. Пракапюк // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 505. – (Народныя і дзіцячыя ўзорныя калектывы).

### *Народнаму хору ветэранаў вайны і працы ўстановы культуры «Кобрынскі Палац культуры»(1987) – 35 гадоў*

Заснаваны ў 1987 г. пры раённым Доме культуры, з 2009 г працуе пры Палацы культуры. Першы кіраўнік - Надзея Міхайлаўна Кандрашук.

**Кобрынскі** народны хор ветэранаў вайны і працы // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2013. – Т. 4. – С. 518.

**Пракапюк, А. Я.** Хор ветэранаў вайны і працы / А. Я. Пракапюк // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 506. – (Народныя і дзіцячыя ўзорныя калектывы).

### *Народнаму клубу аматараў фальклору «Магдаліна» Магдалінскага Дома культуры (1987) - 35 гадоў з часу стварэння*

**Клуб аматараў фальклору «Магдаліна**» Магдалінскага сельскага Дома культуры створаны ў 1987 г. Заснавальнік калектыву - А. П. Букач. Званне народнага прысвоена ў 1995 г.

**Магдалінскі** народны клуб аматараў фальклору «Магдаліна» // Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2-х т. - Мінск, 2006. - Т. 2. - С. 75-76.

**П’янцава, В. В.** Магдалінскі народны клуб аматараў фальклору «Магдаліна» / В. В. П’янцава // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2014. – Т. 5. – С. 217-218.

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Дзівінская дзіцячая школа мастацтваў» (1972) – 50 гадоў*

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзівінская дзіцячая школа мастацтваў»** - установа адукацыі ў сферы культуры, якая рэалізуе адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Дзівінская дзіцячая школа мастацтваў заснавана ў 1972 г. Вядзе навучанне па двух напрамках - музычнаму (акардэон, баян, фартэпіяна, скрыпка,

цымбалы, гітара, балалайка) і харэаграфічнаму. Агульная колькасць навучэнцаў -117. Кадравы склад школы - 12 настаўнікаў, 2 канцэртмайстра.

**Пашковіч, Л.** Беларуская «Бульба» на ўкраінскай сцэне / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2019. — 12 студзеня. — С. 10. - У Дзівінскай школе мастацтваў навучаецца 115 чалавек.

**Пашковіч, Л.** Падарожжа з дапамогай нот / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2016. — 19 сакавіка. — С. 4. - Састаяўся канцэрт творчага калектыва настаўнікаў музыкі Дзівінскай дзіцячай школы мастацтваў.

## *Дзяржаўнай установе адукацыі « Кіселявецкая дзіцячая школа мастацтваў» (1987) – 35 гадоў*

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Кіселявецкая дзіцячая школа мастацтваў»** - установа адукацыі ў сферы культуры, якая рэалізуе адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Кіселявецкая дзіцячая школа мастацтваў заснавана ў 1987 г., мае два філіялы: у аграгарадку Хідры і в. Балоты. Педагагічны калектыў складаецца з 12 настаўнікаў, агульная колькасць вучняў - 72. Школа працуе па музычнаму напрамку дзейнасці (баян, акардэон, фартэпіяна, гітара, эстрадны вакал).

**Казакова, А**. Уголок гармонии и музыки / Анна Казакова // Кобрынскі веснік. - 2018. — 28 сакавіка. — С. 4. - В ГУО «Киселевецкая детская школа искусств» на трех отделениях обучается 33 человека.

**Савчук, М.** С музыкой по жизни / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2012. - 6 декабря. - С. 26. - Киселевецкая школа искусств отметила своё 25-летие.

## *Ансамблю народнай музыкі і песні «Кобрынскія музыкі» Кобрынскага РАУС (1997) – 25 гадоў з часу стварэння*

Створаны ў 1997 г. Званне народнага прысвоена ў 2002 г.

**П’янцава, В. В.** Ансамбль народнай музыкі і песні «Кобрынскія музыкі» / В. В. П’янцава // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 507. - (Народныя і дзіцячыя ўзорныя калектывы).

**Мельнік, Р**. «Кобрынскія музыкі» - з новымі ўзнагародамі! / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2013.— 23 лістапада. — С. 3. - Народны ансамбль музыкі і песні Кобрынскага РАУС прыняў удзел у двух прэстыжных конкурсах.